Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ



Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ
«Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

31 студзеня 2014 года, № 1 (2104)

ПАДЗЕЯ

# «Мы будзем заўсёды разам – нашы ўніверсітэты і нашы краіны!»

**Званне «Ганаровы прафесар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава» прысвоена рэктару БДУ акадэміку Сяргею АБЛАМЕЙКУ.** Адпаведны дыплом яму ўручыў 25 студзеня рэктар расійскай ВНУ акадэмік Віктар Садоўнічы на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета МДУ.



Фота прэс-службы МДУ

Цырымонія адбылася падчас візіту дэлегацыі БДУ ў МДУ імя М. В. Ламаносава для ўдзелу ў мерапрыемствах, прысвечаных 259-годдзю з дня заснавання Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Звання «Ганаровы прафесар МДУ імя М. В. Ламаносава» Сяргей Абламейка ўдастоены за шматгадовае плённае супрацоўніцтва паміж двума ўніверсітэтамі і выбітныя заслугі ў галіне стварэння асноў суперкамп'ютарнай адукацыі.

Рэктар МДУ Віктар Садоўнічы высока ацаніў дасягненні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта як аднаго з флагманаў вышэйшай адукацыі і навукі ў краінах СНД. Ён адзначыў, што БДУ справядліва ўвайшоў у тройку вядучых універсітэтаў постсавецкай прасторы па звестках міжнароднага інфармацыйнага агенцтва «Інтэрфакс», якія былі апублікаваныя ў снежні 2013 г. Такі вынік з'яўляецца высокай ацэнкай адукацыйнай, навукова-даследчай і міжнароднай дзейнасці БДУ.

Прадстаўнічая дэлегацыя БДУ на чале з рэктарам у складзе першага прарэктара Міхаіла Жураўкова, прарэктара па эканоміцы і інвестыцыях Уладзіміра Панарадава, начальніка ГУПЭІД Ірыны Антаневіч і начальніка ГУБУФ Таццяны Каўшэвіч прыбыла ў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт яшчэ 24 студзеня. З самай раніцы беларускіх гасцей прыняў рэктар МДУ Віктар Садоўнічы. Гаворка зайшла пра праграму развіцця МДУ, планы па стварэнні тэхналагічнай даліны МДУ «Вараб'ёвы горы», а таксама пра функцыянаванне Фонду развіцця МДУ. У другой палове дня госці наведалі НДІ ядзернай фізікі МДУ, дзе абмеркавалі развіццё ядзернай фізікі і касмічных праграм, у тым ліку дамовіліся пра актывізацыю сумесных прац па распрацоўцы і запуску міжуніверсітэцкага нанаспадарожніка. Затым яны сустрэліся са старшынёй выканкама Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў Аляксандрам Сідаровічам, з якім закранулі пытанні супрацоўніцтва. Госці азнаёміліся з факультэтам біяінфарматыкі і біяінжынерыі МДУ, дзе абмеркавалі сумесныя працы ў сферы біяінфарматыкі і паназіралі за вытворчасцю лекавых сродкаў.




> *«БДУ шмат у чым дзякуючы менавіта Сяргею Абламейку вядомы ў свеце як буйная сучасная ВНУ, якая значна ўплывае на развіццё навуковага патэнцыялу свету. Гэта сапраўдны флагман сістэмы адукацыі Беларусі»*
>
> **Віктар САДОЎНІЧЫ**

На наступны дзень, 25 студзеня, беларускія госці ўзялі ўдзел у традыцыйнай Боскай літургіі ў Дамавым храме Святой Таццяны, якую правёў Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл. Рэктар БДУ Сяргей Абламейка быў запрошаны на святочную трапезу з патрыярхам. Потым адбылася цырымонія закладкі капсулы новага студэнцкага інтэрната ў будучым гарадку МДУ з удзелам мэра Масквы Сяргея Сабяніна і Віктара Садоўнічага. Прадстаўнікі БДУ наведалі таксама факультэты журналістыкі і псіхалогіі МДУ, дзе абмеркавалі перспектывы супрацоўніцтва.

Увечар на ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным 259-й гадавіне МДУ, рэктар маскоўскай ВНУ акадэмік Віктар Садоўнічы вельмі цёпла прадставіў свайго калегу рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейку. «У Беларускім дзяржаўным універсітэце працуюць нашы самыя лепшыя сябры. На базе БДУ кожны год праходзяць форумы Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў, форумы творчай і навуковай інтэлігенцыі краін СНД і іншыя разнапланавыя мерапрыемствы», – адзначыў Віктар Антонавіч.

У сваёй падзячнай прамове Сяргей Абламейка падкрэсліў вялікі ўклад Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў станаўленне і развіццё БДУ, асабліва вылучыўшы тры этапы: першы – прыезд у Мінск з Масквы першага рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты з групай прафесараў, другі – перыяд працы БДУ ў 1943/44 гг. на станцыі Сходня пад Масквой пры непасрэдным удзеле МДУ, і трэці – апошнія 20 гадоў плённага супрацоўніцтва ў складзе Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў, створанай па ініцыятыве МДУ. «Хачу падзякаваць Вам, паважаны Віктар Антонавіч, за тую вялізную ролю, якую Вы іграеце ў развіцці нашай ВНУ і адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Віншую ўсіх са святам – Днём расійскага студэнцтва і Днём стварэння МДУ, і ўпэўнены, што мы будзем заўсёды разам – нашы ўніверсітэты і нашы краіны», – заўважыў Сяргей Уладзіміравіч.

На ўрачыстым мерапрыемстве прадстаўнікоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта цёпла павіншавалі наша знакамітая зямлячка касманаўт Валянціна Церашкова, а таксама віцэ-прэм'ер РФ Вольга Галадзец, дэпутат Дзярждумы Уладзімір Жырыноўскі, вядомы палітолаг і дзяржаўны дзеяч Вячаслаў Нікалаў і іншыя ганаровыя асобы.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

## Чытайце ў нумары:

**БДУ – ЛІДАР СЯРОД ВНУ БЕЛАРУСІ**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт узначаліў рэйтынг айчынных устаноў вышэйшай адукацыі па выніках прыёмнай кампаніі 2013 г.
Стар. 2

**ЭВАЛЮЦЫЯ Ў АДУКАЦЫІ**
Падкастынг – гэта працэс стварэння і распаўсюджвання гукавых і відэафайлаў у Сеціве. І хімічны факультэт не адстае ад сучасных патрабаванняў
Стар. 3

**ТОР–10. ЭКСПАРТ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ ПРАДУКЦЫІ І ПАСЛУГ БДУ Ў 2013 ГОДЗЕ**
Стар. 4

## Весткі з рэктарата

РЭКТАР БДУ акадэмік Сяргей Абламейка прызначаны **старшынёй савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.** Адпаведны ўказ падпісаў 11 студзеня кіраўнік дзяржавы. Усяго ў складзе савета 20 прадстаўнікоў адукацыйных устаноў, сярод іх таксама дэкан ФПМІ БДУ Павел Мандрык і дырэктар Ліцэя БДУ Вадзім Матуліс.

* * *

ГАНАРОВАГА звання «Заслужаны работнік БДУ» ўдастоены дзесяць супрацоўнікаў.

За шматгадовую добрасумленную працу і вялікі асабісты ўклад у развіццё ўніверсітэта ганаровае званне прысвоена прафесару механіка-матэматычнага факультэта ***Уладзіміру Амелькіну***; вядучаму навуковаму супрацоўніку НДІ ФХП ***Святлане Вараб'ёвай***; загадчыку кафедры тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі эканамічнага факультэта ***Пятру Лямешчанку***; загадчыку НДЛ хіміка-аналітычных сістэм хімічнага факультэта ***Валерыю Ламаку***; прафесару юрыдычнага факультэта ***Тамары Макаравай***; загадчыку кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта ***Вячаславу Рагойшу***; прафесару факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій ***Васілю Садову***; загадчыку кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта ***Віктару Фядосіку***; загадчыку кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі фізічнага факультэта ***Ілью Феранчуку***; загадчыку кафедры геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі механіка-матэматычнага факультэта члену-карэспандэнту НАН Беларусі ***Вячаславу Янчэўскаму.***

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

МАНІТОРЫНГ

# БДУ – лідар сярод ВНУ Беларусі

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт узначаліў рэйтынг айчынных устаноў вышэйшай адукацыі па выніках прыёмнай кампаніі 2013 г.** Гэта даследаванне, у якім удзельнічала 48 ВНУ, упершыню правяло Міністэрства адукацыі нашай краіны. Другое месца заняў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, а на трэцім – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і электронікі.



Мэтай было вывучэнне патэнцыялу студэнтаў І курса, якія паступілі ва ўстановы вышэйшай адукацыі ў 2013 г. Для ацэнкі ўніверсітэтаў у першую чаргу ўлічваліся колькасныя паказчыкі: лік абітурыентаў, прынятых за кошт сродкаў бюджэту і на ўмовах аплаты, і інш. Акрамя таго, прымаліся да ўвагі якасныя паказчыкі – прахадны бал па спецыяльнасцях бюджэтнага і платнага набору.

Таксама для разліку формулы ранжыравання ВНУ ўлічваліся і іншыя паказчыкі, а менавіта: сума балаў, набраных студэнтамі па ўсіх спецыяльнасцях, з улікам выканання кантрольных лічбаў прыёму; колькасць абітурыентаў, прынятых на бюджэт па пэўнай спецыяльнасці; колькасць абітурыентаў, прынятых на ўмовах аплаты па пэўнай спецыяльнасці; прахадны бал па пэўнай спецыяльнасці для абітурыентаў, прынятых за кошт бюджэту і на ўмовах аплаты; колькасць абітурыентаў, залічаных без уступных іспытаў (пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, лаўрэаты спецыяльных фондаў Прэзідэнта Беларусі); колькасць залічаных замежных грамадзян; працэнт выканання кантрольных лічбаў прыёму.

Адзначым, што ў апошнія гады БДУ высока каціруецца ўплывовымі міжнароднымі асацыяцыямі. Так, у ліпені 2013 г. наша ВНУ займала 790 пазіцыю ў Сусветным вэбаметрычным рэйтынгу ўніверсітэтаў (Webometrics Ranking of World Universities). Па версіі вядомага брытанскага агенцтва QS БДУ ўваходзіць у лік 600 найлепшых універсітэтаў. А ў снежні мінулага года БДУ стаў другім у рэйтынгу ВНУ СНД, Грузіі і краін Балтыі.

**Жанна ВАСАНСКАЯ**

АКТУАЛЬНА

# ПАЧАЎ ДЗЕЙНІЧАЦЬ МЕДЫЯЦЭНТР

Новая структура будзе аказваць усебаковую інфармацыйную падтрымку асноўным відам дзейнасці ВНУ, садзейнічаць умацаванню і прасоўванню іміджу БДУ як вядучага ўніверсітэта Беларусі і сучаснага інавацыйнага цэнтра сусветнага ўзроўню.

Апроч гэтага, у кола задач **медыяцэнтра** ўваходзіць рэгуляванне інфармацыйных плыняў універсітэта, распрацоўка і рэалізацыя праграм і праектаў па актыўным асвятленні вынікаў дзейнасці ВНУ, навуковых распрацовак і дасягненняў. Гэта дазволіць значна павялічыць экспарт адукацыйных паслуг і навукова-інавацыйнай прадукцыі БДУ, умацніць канкурэнтаздольнасць БДУ на міжнародных рынках, умацаваць яго лідарскія пазіцыі, імідж і рэпутацыю ў сусветнай адукацыйнай прасторы.

Акрамя таго, медыяцэнтр будзе праводзіць сістэматычны аналіз стану інфармацыйнай працы ва ўніверсітэце, распрацоўваць меры і прапановы па павышэнні яе эфектыўнасці.

За новай структурай замацаваныя функцыі па асвятленні ў вядучых СМІ ўсіх складнікаў дзейнасці комплексу БДУ. Рашэнне гэтых задач ускладзенае на дзейную з 2004 г. ***прэс-службу***, якая ўвайшла ў структуру медыяцэнтра.

Важным складнікам дзейнасці медыяцэнтра з'яўляецца кіраванне сістэмай унутраных камунікацый у БДУ. Рэалізацыяй гэтых задач будзе займацца ***аддзел унутрыўніверсітэцкіх камунікацый***, на які ўскладзеныя абавязкі па выданні карпаратыўнай газеты «Універсітэт», а таксама інфармаванні шматтысячнага калектыву БДУ пра асноўныя падзеі і дасягненні супрацоўнікаў і навучэнцаў.



*Павел Салаўёў*

Шматпланавую працу па прасоўванні іміджу БДУ з дапамогай сучасных мультымедыйных тэхналогій будзе ажыццяўляць ***аддзел вэб-праектаў і стратэгічных камунікацый***. У яго функцыі ўваходзіць каардынацыя дзейнасці падраздзяленняў БДУ па падтрымцы карпаратыўнага сайта, сайтаў падраздзяленняў і тэматычных старонак у сацыяльных сетках, выкарыстанне найноўшых тэхналагічных дасягненняў для мадэрнізацыі і аптымізацыі навучальна-адукацыйнага працэсу шляхам укаранення новых інфармацыйных тэхналогій, электронных сродкаў камунікацыі.

Характэрна, што новыя аддзелы былі створаныя без увядзення дадатковых ставак за кошт аптымізацыі навучальнай фоталабараторыі і аддзела ТСН ГУВНМР, супрацоўнікі якіх былі пераведзеныя ў структурныя падраздзяленні медыяцэнтра.

Падрабязней з функцыямі медыяцэнтра і яго структурай можна азнаёміцца на сайце *www.bsu.by* у раздзеле «Цэнтры».

Медыяцэнтр БДУ – першы ўніверсітэцкі медыяцэнтр, аналагаў якому няма ні ў адной ВНУ Беларусі. Кіраўніком медыяцэнтра прызначаны дасведчаны спецыяліст у сферы камунікацый і грамадскіх сувязяў кандыдат філалагічных навук Павел САЛАЎЁЎ, дацэнт Інстытута журналістыкі, выкладчык Лонданскай школы PR, адзін з распрацоўшчыкаў міжнароднага дыстанцыйнага курса на англійскай мове «Эфектыўная камунікацыя».

**Ксенія КАРАВАЯ**

УШАНАВАННІ

# ПРЫЗНАННЕ ЗА ДЫСЕРТАЦЫІ

Супрацоўнікі БДУ сталі пераможцамі штогадовага рэспубліканскага конкурсу Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь **на найлепшую доктарскую і кандыдацкую дысертацыі 2013 г.**

Загадам ВАК ад 10 студзеня пераможцам конкурсу на найлепшую кандыдацкую дысертацыю 2013 г. *у намінацыі «гуманітарныя навукі»* прызнаны **Алег ГОЛУБЕЎ**, аспірант РІВШ і бібліятэкар Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы БДУ. Дысертацыйнае даследаванне «Вялікае Княства Літоўскае і Канстанцінопальскі патрыярхат: станаўленне і развіццё царкоўна-палітычных узаемаадносін (1316–1387 гг.)» падрыхтаванае ў аспірантуры Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ на кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук Аляксей Віктаравіч Мартынюк. З мэтай даследавання дакументаў з архіва Канстанцінопальскага патрыярхату XIV ст. дысертант двойчы працаваў у сховішчах Аўстрыйскай нацыянальнай бібліятэкі ў Вене. Цікава, што ўпершыню фрагменты корпуса дадзеных дакументаў былі выяўленыя на Афоне і пасля ўведзеныя ў навуковы ўжытак у далёкім XIX стагоддзі выхадцам з Магілёўскай губерні беларускім гісторыкам І. І. Грыгаровічам.



*У намінацыі «прыродазнаўчыя навукі»* дыпломам лаўрэата конкурсу ўзнагароджаны асістэнт кафедры матэматычнага мадэлявання і аналізу даных ФПМІ БДУ **Ігар БАДЗЯГІН** з дысертацыяй «Статыстычнае прагназаванне аўтарэгрэсійных часавых шэрагаў пры наяўнасці цэнзуравання».



Дацэнт БДУ **Жанна НЕКРАШЭВІЧ-КАРОТКАЯ** атрымала 24 студзеня дыплом доктара навук з рук Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Навуковая ступень доктара навук прысуджаная супрацоўніцы кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ за паспяховую абарону дысертацыі «Лацінамоўны ліра-эпас у полілінгвістычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стагоддзяў: традыцыя, гісторыка-эстэтычная эвалюцыя». «Лацінскай паэзіяй я пачала займацца пасля выпуску з універсітэта. Вывучала лацінамоўную літаратуру, ездзіла на стажыроўкі ў розныя краіны, бо арыгінальных тэкстаў у Беларусі амаль не засталося. На шчасце, кіраўніцтва БДУ мне не перашкаджала, а, наадварот, дапамагала. Можна сказаць, што працу над дысертацыяй я пачала адразу пасля заканчэння ўніверсітэта ў 1994 годзе. За гэты час я займалася перакладамі, публікавала навуковыя артыкулы, выдавала манаграфіі і пераклала на беларускую мову паэму Яна Вісліцкага «Пруская вайна», – падзялілася гісторыяй дасягненняў Жанна Некрашэвіч-Кароткая.



Усяго ў 2013 г. навуковая ступень доктара навук была прысуджаная 39 суіскальнікам.

**Паводле інфармацыі УПКВК ГУН**

HI–TECH

# Павысіць якасць вайскоўцаў

Рэспубліканскі цэнтр праблем чалавека БДУ (РЦПЧ) распрацаваў новы апаратна-праграмны комплекс для дыягностыкі прафесійна-псіхалагічнай прыдатнасці супрацоўнікаў МУС.

Гэты комплекс прызначаны для даследавання нейрапсіхалагічных, псіхафізіялагічных і сацыяльна-асабістых якасцяў вайскоўцаў, якія забяспечваюць нацыянальна-дзяржаўную бяспеку і ахоўваюць выпраўленчыя калоніі, адмысловыя грузы, асабліва важныя дзяржаўныя аб'екты. Укараненне новага вынаходства дазволіць павысіць якасць адбору вайскоўцаў для службы ў асобных вайсковых частках Беларусі.

Навуковым кіраўніком праекта з'яўляецца загадчыца лабараторыі псіхафізіялогіі і прафесіяграфіі РЦПЧ Святлана САГАЙДАК. Праца над стварэннем апаратна-праграмнага комплексу працягвалася 2 гады. На сёння ён прайшоў паспяховую апрабацыю на асабістым складзе ўнутраных войскаў, падчас якой былі пратэставаныя звыш 200 вайскоўцаў, якія праходзяць службу па кантракце ў выпраўленчых калоніях. У найбліжэйшы час новая распрацоўка будзе выкарыстоўвацца структурамі МУС, а іх штатныя псіхолагі пройдуць навучанне для працы з дадзеным комплексам у БДУ.

Комплекс РЦПЧ ужо атрымаў высокую ацэнку. За цесную ўзаемадзеянне і дзелавое супрацоўніцтва калектыў распрацоўшчыкаў быў узнагароджаны граматай камандуючага ўнутраных войскаў МУС Беларусі. Цырымонія ўручэння адбылася 16 студзеня ў Ваеннай акадэміі Беларусі.

**Ірына МІРОНАВА**

НАВАЦЫІ

# Эвалюцыя ў адукацыі

**У лік інавацыйных адукацыйных тэхналогій зараз уваходзяць лекцыі ў падкастынгу.**
Дарэчы, падкастынг – гэта працэс стварэння і распаўсюджвання гукавых і відэафайлаў у Сецыве. І хімічны факультэт не адстае ад сучасных патрабаванняў: на яго рахунку ўжо шэсць такіх лекцый.




Тут ствараюць выдатныя ўмовы для таго, каб студэнт мог самастойна прапрацаваць матэрыял. Зараз амаль уся моладзь карыстаецца сучаснымі гаджэтамі, і ў яе ёсць шмат спосабаў азнаёміцца з вучэбнымі падкастамі: можна слухаць выкладчыка ў фармаце MP3 на плэеры ці глядзець відэа на мабільным тэлефоне. А калі падлічыць, колькі часу губляецца на дарогу ва ўніверсітэт, то магчымасць рыхтавацца да заняткаў у аўтобусе, тралейбусе ці нават электрычцы будзе ўвогуле бясцэннай.

Нягледзячы на тое, што ў рэальнасці выкладчыка побач няма, за кошт яго выявы на экране з'яўляецца ўражанне нябачнай – віртуальнай – прысутнасці. Лекцыі ў падкастынгу – прадукт «тры ў адным», бо яны складаюцца з відэазапісу, аўдыязапісу і мультымедыйнай прэзентацыі. Праглядаць іх можна як разам, так і паасобку. Напрыклад, калі студэнт не жадае бачыць свайго настаўніка падчас агучвання тэмы, ён здольны «схаваць» відэа і пакінуць толькі голас. А калі ў навучэнца лепш працуе зрокавая памяць, заўсёды можна адключыць гук і чытаць матэрыял са слайдаў звычайнай прэзентацыі.

Каб самастойна ацаніць узровень сваёй падрыхтоўкі, напрыканцы кожнай лекцыі змяшчаецца тэст.

Разам з намеснікам дэкана па навуковай працы ***Таццянай Савіцкай*** мы адвольна адказваем на прапанаваныя пытанні. Кожны раз з'яўляецца надпіс «правільна» ці «няправільна», а пасля – агульны вынік. У нашым выпадку гэта сорак балаў са ста максімальных і прапанова праграмы «Калі ласка, паўтарыце з пачатку». Таццяна Аляксандраўна тлумачыць, што тэст не вельмі складаны і студэнту з адпаведнай колькасцю балаў патрабуецца працягваць падрыхтоўку перад заняткамі. Гэта вельмі зручна напярэдадні іспытаў: будучыя хімікі самі бачаць узровень сваіх ведаў, разумеюць, што трэба ўдасканаліць.

Сістэма лекцый у падкастынгу на хімфаку ўжо прайшла праверку на практыцы. Было гэта так: студэнты атрымлівалі заданне, рыхтаваліся дома па новым прадукце, а пасля прыходзілі на семінар, дзе выкладчык рабіў апытанне па засвоеных самастойна тэмах. Акрамя таго, улічваліся водгукі самых навучэнцаў. Ім спадабалася, ды і вынікі апытання былі нядрэнныя. Але чаму існуе толькі шэсць лекцый-падкастаў? Па-першае, іх стварэнне – вельмі працаёмкі працэс. Выкладчыку трэба добра падрыхтавацца да выступу перад камерай, дадаткова прапрацаваць вучэбны матэрыял. Зразумела, што змешчанае ў электронным выглядзе не будзе ізноў паўтарацца перад аўдыторыяй, таму неабходна звяртаць увагу на ўсе дэталі. З'яўленне нават адной лекцыі адбываецца не за адзін дзень. Падругое, яны займаюць многа месца і павінны быць размешчаны дзесьці са свабодным доступам для ўсіх навучэнцаў. Але эвалюцыя адукацыі, без сумневаў, працягваецца. Пакуль у БДУ няма асобнага інтэрнэт-канала, на якім будуць размешчаны толькі лекцыі ў падкастынгу, хімфак на сваім афіцыйным сайце размясціў банер «Інавацыйныя тэхналогіі ў адукацыі» з пераходам на рэсурс, дзе можна ў адкрытым доступе знайсці гэтыя лекцыі, а таксама пазнаёміцца з досведам па іх стварэнні.

«Лічу, што выкладчыкі павінны рыхтаваць студэнтаў да іх будучыні, – кажа Таццяна Аляксандраўна. – Яны цяпер – зусім іншае пакаленне, і вучыць іх трэба трохі інакш. Таму тыя ВНУ, што імкнуцца не адставаць ад часу, зараз выкарыстоўваюць тэхналогіі падкастынгу».

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**1 студзеня Гваздовіч Галіна Аляксандраўна,** дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання

**2 студзеня Русовіч Васіль Іванавіч,** дацэнт кафедры дыпламатычнай і консульскай службы

**4 студзеня Апостал Наталля Аляксандраўна,** дацэнт кафедры аналітычнай хіміі

**5 студзеня Войцік Анатоль Аляксандравіч,** дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права

**8 студзеня Чартко Мікалай Канстанцінавіч,** прафесар кафедры глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм

**9 студзеня Самусенка Анатоль Васілевіч,** дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі

**12 студзеня Барздоў Уладзімір Міхайлавіч,** прафесар кафедры фізічнай электронікі і нанатэхналогій

**15 студзеня Блашкоў Юрый Андрэевіч,** дацэнт кафедры гісторыі Расіі

**19 студзеня Яцкоў Мікалай Мікалаевіч,** дацэнт кафедры сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання

**20 студзеня Гусараў Ігар Уладзіміравіч,** дырэктар навучальна-спартыўнага комплексу БДУ «Буравеснік»

**23 студзеня Конанава Алена Іванаўна,** дацэнт кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры

**24 студзеня Слуцкая Людміла Уладзіміраўна,** дацэнт кафедры паліталогіі

**25 студзеня Казачонак Віктар Уладзіміравіч,** прафесар кафедры камп'ютарных тэхналогій і сістэм

**31 студзеня Юрык Валянціна Уладзіміраўна,** дацэнт кафедры міжнароднага менеджменту

**31 студзеня Стэльмах Георгій Фаміч,** загадчык кафедры фізічнай інфарматыкі і атамна-малекулярнай фізікі

*Спіс усіх імянніннікаў размешчаны на сайце БДУ www.bsu.by у раздзеле «Нашы юбіляры».*

**Паводле інфармацыі ўпраўлення кадраў БДУ**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізікі і аэракасмічных тэхналогій, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, сацыялогіі журналістыкі, псіхалогіі,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: тэорыі і метадалогіі журналістыкі, псіхалогіі,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, гісторыі Расіі, крыніцазнаўства, гіторыі паўднёвых і заходніх славян, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, нямецкай мовы, фізічнага выхавання і спорту, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, паліталогіі, канстытуцыйнага права, грамадзянскага права, экалагічнага і аграрнага права, тэорыі і метадалогіі журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, перыядычнага друку, псіхалогіі, сацыяльнай камунікацыі, філасофіі культуры, філасофіі і метадалогіі навукі,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, інфармацыйных тэхналогій, нямецкай мовы, агульнанавуковых дысцыплін, экалогіі чалавека, фізічнага выхавання і спорту, грамадзянскага права, крымінальнага права, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, філасофіі культуры, філасофіі і метадалогіі навукі,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнанавуковых дысцыплін, тэорыі і практыкі перакладу.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5 а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: кіравання маёмасцю, мастацтваў, прававых дысцыплін,
СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры мастацтваў,
ВЫКЛАДЧЫКА кафедры мастацтваў.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.*

**«ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ» БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі ядзернай оптыкі і космамікрафізікі – 2 чал.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб`явы.*
*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226 42 31.*

АСОБЫ

# З замежнікамі па-руску

26 студзеня адзначыў 75-гадовы юбілей дацэнт факультэта даўніверсітэцкай адукацыі **Уладзімір РАДЗІВОНАЎ.**


Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

*Уладзімір Радзівонаў: «Размаўляць будзем па-руску»*

З 1974 г. працоўная біяграфія Уладзіміра Нічыпаравіча ідзе поруч з БДУ, з 1984 г. – праца, звязаная з навучаннем замежных студэнтаў. Больш за 15 гадоў ён загадваў кафедрай рускай мовы як замежнай на падрыхтоўчым факультэце для замежных грамадзян. За гэтыя гады Уладзімір Нічыпаравіч падрыхтаваў шмат спецыялістаў для краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Працаваў на курсах рускай мовы Кембрыджскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія). З 1989 па 1992 гг. – на пасадзе дырэктара філіяла Інстытута рускай мовы імя А. С. Пушкіна (Масква) у Камбоджы.

У. Н. Радзівонаў у суаўтарстве апублікаваў шэраг дапаможнікаў па курсе «Асновы эканомікі». У навучанні замежных слухачоў шырока выкарыстоўвае элементы разнастайных інавацыйных адукацыйных тэхналогій. Актыўна ўдзельнічае ў працы рэспубліканскіх і міжнародных навукова-практычных канферэнцый.

Уладзімір Нічыпаравіч шмат часу прысвячае грамадскай працы: у 80-я гады – член аргкамітэта па правядзенні першых Дзён філолага БДУ ў Вязынцы на радзіме Янкі Купалы, у 90-я гады – вучоны сакратар савета рэктараў г. Мінска.

У 2011 г. У. Н. Радзівонаў удастоены ганаровага звання «Заслужаны супрацоўнік БДУ» за шматгадовую добрасумленную працу і вялікі асабісты ўклад у развіццё ВНУ і значны ўклад у падрыхтоўку спецыялістаў для замежных краін. Ён таксама неаднаразова ўзнагароджваўся ганаровымі граматамі альма-матар.

Прафесіяналізм, інтэлігентнасць, зычлівасць і карэктнасць у зносінах дапамаглі здабыць Уладзіміру Нічыпаравічу аўтарытэт і павагу сярод супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта і ўніверсітэта.

Калектыў ФДА сардэчна віншуе Уладзіміра Радзівонава з юбілеем і жадае яму дужага здароўя, жыццёвай энергіі і новых творчых здзяйсненняў.

**Супрацоўнікі факультэта**

# БДУ ў СМІ Беларусі

**Інтэрв'ю рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі** – «Гродзенская праўда», grodnonews.by (24.12), «Настаўніцкая газета», nastgaz.by (09.01).

**БДУ ў тройцы лідараў па выніках рэйтынгу ўніверсітэтаў СНД, Грузіі, Латвіі, Літвы і Эстоніі** – interfax.ru, strf.ru, newsru.com, gazeta.ru, osvic.ru, rus.delfi.lv, zaks.ru, actualcomment.ru, metronews.ru (17.12), БелТА, kv.by, belarusfacts.by, open.by, 7x7-journal.ru, embassybel.ru, com-stol.ru, by.mirtv.ru (МТРК «МИР»), akvobr.ru, generation.by, radiomir.by, rosnou.ru, soyuz.by, novoteka.ru (18.12), СТБ, edu.gov.by (19.12), «Настаўніцкая газета», nastgaz.by (21.12), БелТА, 21.by (25.12), kudapostupat.by (26.12), zn.by (26.12), «Звязда» (14.01).

**Цэнтр інавацыйных ідэй і праектаў Start-Up адкрыўся ў БДУ** – БелаПАН (17.12), zn.by, telegraf.by, БелТА, belisa.org.by, belarusfacts.by, wuz.by, popal.by, belport.by, novostimira.com, megacat.by (18.12), Tut.by, NewsFiber.com (20.12), «Настаўніцкая газета», nastgaz.by, allmedia.ru, so-l.ru (21.12), БелТА (25.12), zn.by (26.12).

**Радыё «Юністрар БДУ» прызнана «Выбарам года–2013»** – interfax.by, press.net.by (16.12), aif.by (18.12)

**Каляднае свята «Мы калядам заўжды рады» на філалагічным факультэце БДУ** – АТН (БТ-1), press.net.by (17.12).

**Дні адчыненых дзвярэй у БДУ** – naviny.by, БелаПАН, 21.by (25.12), ЛіМ (27.12).

**Калядны баль прайшоў у БДУ** – naviny.by, БелаПАН (25.12), belpost.by (26.12), tut.by, onliner.by, 21.by, newsfiber.com (27.12).

**Пра навучанне замежнікаў у БДУ** – «Настаўніцкая газета», nastgaz.by (04.12).

**Інтэрв'ю першага прарэктара БДУ Міхаіла Жураўкова** – «Настаўніцкая газета», nastgaz.by (09.01), «Рэспубліка», respublika.info (14.01).

**БДУ ўзначаліў рэйтынг ВНУ Беларусі па выніках прыёмнай кампаніі** – БелТА, interfax.by, БелаПАН, naviny.by, 21.by, generation.by, nn.by, edu.gov.by, tut.by, russian.news.cn, regnum.by, uaport.net, belarusfacts.by, belmy.by, АНТ, radiomir.by (09.01), wuz.by, ej.by (10.01), «Звязда», mail.ru, БТ-1, marketing.by, kp.by, Tut.by (10.01), «Знамя юности», zn.by (11.01)

**Пра стварэнне ў БДУ медыяцэнтра** – megacat.by (12.01), popal.by (13.01), telegraf.by, kv.by (14.01).

**Рэспубліканскі цэнтр праблем чалавека БДУ распрацаваў апаратна-праграмны комплекс для дыягностыкі прафесійна-псіхалагічнай прыдатнасці супрацоўнікаў МУС** – Мінск-навіны (16.01), БелаПАН, wuz.by, 21.by, telegraf.by, naviny.by 21.by (17.01), БелТА (18.01).

**Пра цэнтр Інстытута караля Седжона на ФМА БДУ** – БелТА, БелаПАН, naviny.by, 21.by, 162. by, rambler.ru, АНТ, БТ-1 (18.01).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# Экспарт навукова-тэхнічнай прадукцыі і паслуг БДУ ў 2013 годзе

**1. Даследаванні ў галіне нанаэлектрамагнетызму**

Аб'ём экспарту паслуг – 351 700 дол. ЗША

Заказчык – ЕС, партнёры: Германія, Балгарыя, Італія, Грэцыя

Навуковы кіраўнік: ***Максіменка Сяргей Афанасьевіч***, доктар фізіка-матэматычных навук, лабараторыя электрадынамікі неаднастайных асяроддзяў НДІ ядзерных праблем БДУ.

Навукоўцы БДУ стварылі новы навуковы кірунак – нанаэлектрамагнетызм, які аб'яднаў метады і падыходы класічнай электрадынамікі і сучаснай квантавай фізікі кандэнсаванага стану і фізічнай электронікі. Гэты тэрмін зараз атрымаў міжнароднае прызнанне і стаў агульнаўжывальным, а ўклад групы навукоўцаў НДІ ЯП БДУ у развіццё дадзенага кірунку прызнаны ва ўсім свеце.

За ўклад у развіццё нанаэлектрамагнетызму доктар фізіка-матэматычных навук С. А. Максіменка абраны ганаровым членам міжнароднага грамадства оптыкі і фатонікі (SPIE Fellow). У 2011 г. групе супрацоўнікаў лабараторыі прысвоеная прэмія БДУ імя акадэміка А. Н. Сеўчанкі за цыкл прац «Электрадынаміка нанаструктур». У маі 2012 г. у Мінску прайшла міжнародная канферэнцыя «Фундаментальны і прыкладны нанаэлектрамагнетызм» з удзелам больш за 120 навукоўцаў з 19 краін. Унікальная па складзе экспертаў, яна стварыла ўмовы для абмену досведам і ідэямі, якія леглі ў аснову далейшых сумесных прац і новых праектаў.

Сфера ўжывання: матэрыялазнаўства (палімерныя ахоўныя пакрыцці, новыя матэрыялы для абароны ад нейтронаў), оптыка, медыцына, авіябудаванне.

**2. Крыніцы сілкавання імпульснага тыпу для электратэхнічных прылад**



Аб'ём пастаўкі прыбораў – 238 тыс. дол. ЗША

Заказчык – ААТ «Космасавіяспецбуд», Расія

Навуковы кіраўнік: ***Лапшын Вадзім Аляксандравіч***, кандыдат фізіка-матэматычных навук, лабараторыя радыягалаграфіі НДІ ПФП.

Тэхналагічная навізна прылад заключаецца ў кардынальнай змене структуры крыніц сілкавання – ва ўжыванні імпульсных метадаў кіравання токам і напружаннем у нагрузцы крыніц сілкавання вялікай магутнасці, што выключае баластныя ферарэзанансныя рэгулявальныя вузлы, якія непрадукцыйна спажываюць значную колькасць (да 40 % і больш) электраэнергіі ў крыніцах сілкавання магутнасцю да 10 кВт і больш. Крыніцы сілкавання забяспечваюць бесперапынную працу на працягу больш як 500 гадзін.

Сфера ўжывання: тэхналагічныя плазменныя паскаральнікі, зварка, кінапраекцыйная тэхніка, асвятляльная апаратура вялікай магутнасці, медыцына

**3. Тэхналогія атрымання валакна, якое затухае само, з раствораў прыродных палімераў.**



Аб'ём паслуг – 195 500 дол. ЗША

Заказчык – ААТ «Формаш», Расія

Навуковы кіраўнік: ***Грыншпан Дзмітрый Давыдавіч***, доктар хімічных навук, прафесар, лабараторыя раствораў цэлюлозы і прадуктаў іх перапрацоўкі НДІ ФХП.

Тэхналогія атрымання ўнікальнага цэлюлозна-хітазанавага валакна дазволіць распрацаваць прынцыпова новы асартымент валокнаў і нітак, які адсутнічае сёння на сусветным рынку. Цэлюлозна-хітазанавае валакно ў адрозненне ад вогнеахоўнай сінтэтычнай тканіны можа быць скарыстана для вытворчасці не толькі верхняй вопраткі, але і бялізнавага трыкатажу. Пры гэтым яго сабекошт з-за пераваг новай бессераўвуглероднай тэхналогіі ў параўнанні з коштам хітазанавых валокнаў будзе прыкладна ў 20 разоў меншым. У інтарэсах беларускага спажыўца будзе арганізаваная вопытна-прамысловая вытворчасць нітак, якія затухаюць самі, магутнасцю 3000 кг у год у ААТ «Светлагорскхімвалакно». Мяркуецца будаўніцтва новага завода магутнасцю 20 000 т/год.

Сфера ўжывання: хімічная прамысловасць, вытворчасць вогнеахоўных матэрыялаў.

**4. Тэхналогія вытворчасці кампазіцыйнага цвёрдага паліва з адкідаў нафтапрадуктаў і гідролізнага лігніну**



Аб'ём паслуг – 162,5 тыс. дол. ЗША

Заказчык – ААТ «Формаш», Расія

Навуковы кіраўнік: ***Грыншпан Дзмітрый Давыдавіч***, доктар хімічных навук, прафесар, лабараторыя раствораў цэлюлозы і прадуктаў іх перапрацоўкі НДІ ФХП.

Праект накіраваны на распрацоўку вопытна-прамысловай вытворчасці новага віду цвёрдага кампазіцыйнага паліва ў выглядзе грануляту і пелет з вадкіх нафта- і алеязмяшчальных адкідаў і гідрафабізаванага лігніну. Лігнін з'яўляецца пабочным прадуктам (адкідам) гідролізных і цэлюлозна-папяровых вытворчасцяў і знаходзіцца ў адвалах пры гідролізных заводах Беларусі, Расіі і іншых краін. Пералічаныя адкіды забруджваюць навакольнае асяроддзе, і таму іх выкарыстанне ў кампазіцыі з гідролізным лігнінам дазволіць вырашыць не толькі экалагічную праблему, але і часткова рэгіянальную энергетычную праблему.

Сфера ўжывання: хімічная прамысловасць, энергетыка

**5. Спірометр аўтаматызаваны шматфункцыянальны «МАС-1»**



Аб'ём пастаўкі прыбораў – 131 тыс. дол. ЗША

Заказчыкі – установы аховы здароўя Расіі – 30 прыбораў і Інданэзіі – 13 прыбораў.

Навуковы кіраўнік: ***Манічаў Ігар Аляксандравіч***, кандыдат фізіка-матэматычных навук, лабараторыя распрацоўкі прыбораў для спірометрыі УП «Унітэхпрам БДУ».

Аўтаматызаваны шматфункцыянальны прыбор «МАС-1» прызначаны для ацэнкі стану дыхальнай сістэмы чалавека з дапамогай вымярэння і вылічэння параметраў знешняга дыхання, іх параўнання з закладзенымі ў памяць спірометра нарматывамі, а таксама візуалізацыі працэсу дыхання. Па дакладнасці вымярэнняў, функцыянальных магчымасцях, сучасным дызайне «МАС-1» не саступае найлепшым сусветным аналагам. Зараз у Беларусі паспяхова эксплуатуецца каля 1000 спірометраў «МАС-1».

Сфера ўжывання: медыцына, ахова здароўя.

**6. Вадкакрышталічныя матэрыялы і дысплейныя тэхналогіі**

Аб'ём экспарту паслуг – 88 тыс. дол. ЗША

Заказчык – Хейлунцзянскі інстытут нафтахіміі, Кітай

Навуковы кіраўнік: ***Лапанік Валерый Іванавіч***, кандыдат тэхнічных навук, лабараторыя оптыкі кандэнсаваных асяроддзяў НДІ ПФП

Распрацаваныя вадкакрышталічныя злучэнні і кампазіцыі на іх аснове для TN, STN, TFT і FLC дысплеяў вялікай інфарматыўнай ёмістасці (маніторы, ноўтбукі, тэлевізары), а таксама дысплейныя тэхналогіі для стварэння хуткадзейных прылад адлюстравання інфармацыі з шырокатэмпературным спектрам. Тэхналогіі і ВК-матэрыялы запатэнтаваныя ў Беларусі, ЗША, Германіі, Швейцарыі, Японіі, Вялікабрытаніі, Польшчы.

Сфера ўжывання: электроніка, інфармацыйныя тэхналогіі, тэлекамунікацыя і радыётэхніка.

**7. Залівальна-змешвальнае абсталяванне высокага і нізкага ціску для вытворчасці вырабаў з пенапаліўрэтанаў**



Аб'ём экспарту паслуг – 85 тыс. дол. ЗША

Заказчыкі – ТАА «Радва», г. Наварасійск, ТАА «Навасібірскі завод пластмас «Юніс», г. Навасібірск, ЗАТ «Электракрыніца», г. Саратаў, ААТ «Аўтаагрэгат» г. Ліўны Арлоўскай вобл., Расія

Навуковы кіраўнік: ***Ксенафонтаў Міхаіл Аляксандравіч***, доктар фізіка-матэматычных навук, лабараторыя фізіка-хіміі палімерных матэрыялаў і прыродных арганічных злучэнняў НДІ ПФП.

Залівальна-змешвальная ўстаноўка высокага ціску прызначаная для вытворчасці шырокага асартыменту цеплаашчадных вырабаў з пенапаліўрэтанаў.

Залівальна-змешвальная ўстаноўка нізкага ціску прызначаная для герметызацыі электравырабаў палімернымі кампаўндамі (вытворчасць літай ізаляцыі).

Сфера ўжывання: энергетыка, будаўніцтва, аўтамабілебудаванне, электратэхніка, дрэваапрацоўка, мэблевае будаўніцтва і інш.

**8. Спектрафотаметрычны комплекс СФК**



Аб'ём экспарту паслуг – 54 100 дол. ЗША

Заказчык – ІЗМІРАН г. Троіцк Маскоўскай вобл., Расія

Навуковыя кіраўнікі: ***Бляеў Барыс Іларыёнавіч, Каткоўскі Леанід Уладзіміравіч***, дактары фізіка-тэхнічных навук, аддзел аэракасмічных даследаванняў НДІ ПФП

Распрацаваны і створаны для касмічнага эксперыменту «Гідраксіл-МКС» – актычныя назіранні стану верхняй атмасферы для прагназавання геафізічных катастроф. СФК забяспечвае рэгістрацыю прасторавых размеркаванняў з высокім спектральным вырашэннем у вышынным дыяпазоне 80–110 км з вырашэннем па вышыні не горшым за 1 км. СФК будзе дастаўлены на Міжнародную касмічную станцыю ў другой палове 2014 г. у складзе шматмэтавага лабараторнага модуля «Навука».

Сфера ўжывання: касмічныя даследаванні.

**9. Новыя каталізатары для палімерызацыі ізабутылену**

Аб'ём экспарту – 48 тыс. дол. ЗША

Заказчык – фірма BASF SE, Германія

Навуковы кіраўнік: ***Касцюк Сяргей Віктаравіч***, кандыдат хімічных навук, лабараторыя каталізу палімерызацыйных працэсаў НДІ ФХП

Поліізабутылены з нізкай малекулярнай масай (ад 1000 да 2300), якія змяшчаюць рэакцыйназдольныя вініліднавыя групы, ужываюцца ў якасці прамежкавых прадуктаў у сінтэзе беззольных асадак да паліва і алеяў. Распрацаваныя каталітычныя сістэмы маюць высокі патэнцыял для выкарыстання іх у прамысловым маштабе замест тых каталітычных сістэм на аснове эфіратаў BF3, што выкарыстоўваюцца зараз.

Сфера ўжывання: энергетыка, аўтамабільная прамысловасць.

**10. Даследаванні ў галіне сацыяльных навук**

Выканавец: Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій.

**Праект 1:** Здароўе насельніцтва і ахова здароўя ў краінах СНД у эпоху сацыяльных перамен: стан і тэндэнцыі развіцця

Кіраўнікі праекта: ***Брыгадзін Пётр Іванавіч,*** доктар гістарычных навук, дырэктар ДІКСТ БДУ; ***Ротман Давыд Генрыхавіч,*** доктар сацыялагічных навук, дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ

Заказчык – Інстытут паслядыпломнай адукацыі, г. Вена, Аўстрыя

Аб'ём экспарту – 45 тыс. дол. ЗША

У рамках праекта вывучалася якасць жыцця ў 8 краінах СНД, распаўсюджанасць фактараў рызыкі, звязаных са здароўем, іх сацыяльныя, культурныя, эканамічныя дэтэрмінанты і наступствы для здароўя насельніцтва.

**Праект 2:** Вывучэнне бізнес-асяроддзя і функцыянавання прадпрыемстваў

Кіраўнік праекта: ***Лявіцкая Ірына Уладзіміраўна,*** кандыдат сацыялагічных навук, НДЛ сацыялагічных і маркетынгавых даследаванняў «Грамадская думка» ДІКСТ БДУ

Заказчык: Ipsos MORI, г. Лондан, Вялікабрытанія

Аб'ём экспарту – 37 тыс. дол. ЗША

У выніку даследавання атрыманыя даныя, якія дэманструюць статыстычна значныя індыкатары бізнес-асяроддзя Беларусі супастаўныя з сусветнымі эканомікамі; створаная панэль даных на ўзроўні прадпрыемстваў. Падобная інфармацыя мае значны ўплыў на прыняцце рашэнняў па інвестыцыях.

Сфера ўжывання: органы кіравання, сацыяльныя ўстановы, акадэмічныя інстытуты, СМІ.

**Паводле інфармацыі ГУН**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

31 студзеня 2014 года
Падпісана да друку 29.01.2014 г.
Зак. 794. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспр. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*